***Корабава Г. А.***

# ПРАЦЭСУАЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА ГРАМАДСКІХ АБВІНАВАЎЦАЎ І АБАРОНЦАЎ У КРЫМІНАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ БССР (1957–1990 гг.)

*Корабава Ганна Аляксандраўна, магістрантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, corobova.anuta@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік: канд. юрыд. навук, дацэнт Голубева Л. Л.*

Савецкая дзяржаўная ідэалогія пасля смерці І. В. Сталіна ў 1953 г. і знікнення культу яго асобы нанава звярнулася да дэмакратычных прынцыпаў будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, выпрацаваных У. І. Леніным. З гэтай прычыны ў 1958 г. ідэя ўдзелу грамадскасці ў крымінальным працэсе набыла важнае значэнне.

Палітыка дэмакратызацыі крымінальнага судаводства была адлюстравана ў арт. 15 Закона СССР «Аб зацвярджэнні Асноў заканадаўства аб судаўладкаванні Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік» ад 25 снежня 1958 г. Згодна з ім прадстаўнікі грамадскіх арганізацый маглі здзяйсняць грамадскае абвінавачванне і грамадскую абарону ў судзе. Артыкулам 41 Закона СССР «Аб зацвярджэнні Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік» ад 25 снежня 1958 г. было вызначана, што ў судаводстве па крымінальных справах дапускаліся да ўдзелу прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і калектываў працоўных, якія па пастанове суда маглі быць дапушчаны да ўдзелу ў судовым разглядзе крымінальных спраў у якасці грамадскіх абвінаваўцаў і грамадскіх абаронцаў. Такім чынам, у крымінальным працэсе Саюза ССР, саюзных і аўтаномных рэспублік з’явіліся новыя ўдзельнікі крымінальнага працэсу – грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца. Іх працэсуальнае становішча ў крымінальным працэсе Беларускай ССР вызначалася Крымінальным працэсуальным кодэксам БССР 1960 г. (далей – КПК 1960 г.).

Статус самастойнага ўдзельніка крымінальнага працэсу прадстаўнік грамадскасці набываў толькі паводле спецыяльнай судовай пастановы або вызначэння ў распарадчым пасяджэнні суда. Згодна з арт. 249 КПК 1960 г. грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца мелі права прымаць удзел у даследаванні доказаў, заяўляць хадайніцтвы і адводы перад судом, удзельнічаць у судовых спрэчках.

Паводле арт. 250 КПК 1960 г. няяўка грамадскага абвінаваўцы ці грамадскага абаронцы ў судовае пасяджэнне не цягнула абавязковага адкладання разгляду справы, але пра гэта патрэбна было апавясціць адпаведную грамадскую арганізацыю. Новаўступіўшым у справу грамадскаму абвінаваўцу, грамадскаму абаронцу павінен быў быць дадзены час для падрыхтоўкі да судовага разбору, роўна як і новаўступіўшым у справу пракурору і абаронцу, што падкрэслівала значнасць удзелу грамадскага абвінаваўцы і абаронцы ў судовым разборы і іх працэсуальную роўнасць з пракурорам і абаронцам.

Варта адзначыць, што арт. 273 КПК 1960 г. не прадугледжваў магчымасці заявіць адвод грамадскаму абвінаваўцу, што адрознівала яго ад пракурора.

Згодна з арт. 280 КПК 1960 г., прапановы грамадскага абвінаваўцы і грамадскага абаронцы ўлічваліся пры ўстанаўленні парадку даследавання доказаў.

Паводле арт. 297 КПК 1960 г. грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца мелі магчымасць заявіць хадайніцтвы аб дапаўненні судовага следства пасля даследавання ўсіх прадстаўленых доказаў.

На падставе арт. 249 і 298 КПК 1960 г. грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца прымалі ўдзел у судовых спрэчках, дзе выступалі з прамовай. Варта звярнуць увагу, што палажэнні арт. 249 КПК 1960 г. акрэслівалі кола пытанняў, якія маглі закрануць грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца ў сваёй прамове.

У арт. 315 КПК 1960 г. прадугледжвалася, што суд пры складанні ўводнай часткі прысуду быў павінен адзначыць у якасці ўдзельнікаў грамадскага абвінаваўцу і грамадскага абаронцу, што яшчэ раз падкрэслівала наяўнасць самастойнага працэсуальнага становішча грамадскага абвінаваўцы і грамадскага абаронцы.

Як удзельнікі крымінальнага працэсу, грамадскія абвінаваўцы і грамадскія абаронцы прымалі ўдзел у разглядзе спраў у судзе першай інстанцыі, і толькі на гэтым этапе маглі карыстацца роўнымі з іншымі ўдзельнікамі правамі. Але яны не мелі права абскардзіць прысуд у выпадку нязгоды з ім.

Такім чынам, грамадскі абвінаваўца і грамадскі абаронца з’яўляліся самастойнымі ўдзельнікамі крымінальнага працэсу, якія выконвалі крымінальна-працэсуальныя функцыі абвінавачвання і абароны ад імя грамадскасці. Для іх належнага здзяйснення крымінальна-працэсуальнае заканадаўства надзяляла грамадскага абвінаваўцу і грамадскага абаронцу даволі шырокім колам правамоцтваў. Але ўдзел грамадскага абвінаваўцы і грамадскага абаронцы ў крымінальным працэсе абмяжоўваўся толькі разглядам крымінальных спраў у судзе першай інстанцыі.

***Кузурава Д. Д.***

## ПРАВАВЫ СТАТУС ЖАНЧЫНЫ Ў СТАТУТАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

*Кузурава Дар’я Дзмітрыеўна, студэнтка 2 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, law.kuzuroba@bsu.by*

*Навуковы кіраўнік: канд. юрыд. навук, дацэнт Голубева Л. Л.*

У Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) жанчынам надавалася вялізарная свабода: яны мелі права на маёмасць і спадчыну, на абарону ад гвалту. Першыя кадыфікаваныя прававыя акты, Статуты, з’яўляліся падмуркам для рэалізацыі жанчынай сваіх правоў.